Пётра Васілеўскі



...дзяржаўным герб робіць улада,
але нацыянальным ён становіцца
толькі са згоды грамадства...

# Зорны кантэкст для “Пагоні”,

***альбо Дзяржаўны герб як візітоўка нацыі***

*«І знак вялікі паказаўся на небе:*
*жанчына, апранутая ў сонца і месяц пад нагамі ў яе,*
*і на галаве яе вянок з дванаццаці зорак».*
Адкрыцьцё Іаана Багаслова, 12:1.

Самы кароткі канспект гісторыі краіны – гэта хранала-гічны відэашэраг, складзены з гербаў, што ў розныя часы сімвалізавалі на гэтай зямлі рэальную ўладу, а таксама барацьбу за яе і з ёю. Геральдыка апавядае пра маральныя страты і тэрытарыяльныя набыткі, ваенныя перамогі і палітычныя паразы, пра знаходжаньне ў няволі і невынішчальную прагу свабоды. Ёсьць рэчы настолькі звыклыя, што іх перастаеш заўважаць. Той жа дзяржаўны герб. Ён на фасадах будынкаў і на бланках афіцыйных папераў, на кукардах і шэўронах, спартовай форме і акцызных марках. Звычайна грамада пачынае зьвяртаць на герб увагу, толькі калі яго... здымаюць, каб замяніць на іншы. Разам з тым, герб як сімвал, які мае дачыненьне да кожнага грамадзяніна, нібы магніт прыцягвае

да сябе палітычныя жарсьці. Ён можа паспрыяць грамадскай згодзе ў крызіснай сітуацыі альбо “на роўным месцы” справакаваць “халодную грамадзянскую вайну” з пагрозаю ператварэньня ў вайну гарачую. Што ні кажы, а дзяржаўны герб – гэта візітоўка нацыі, і ў гэтай якасьці ён ці падстава да гонару за краіну, ці прычына комплексу нацыянальнай непаўнавартасьці.

Геральдыка, як мастацтва і навука, мае свае законы і каноны, традыцыю і навацыі. Як і ў любым мастацтве зыходных, базавых формаў у геральдыцы няшмат. Усе гербы, што ёсьць у сьвеце – дзяржаўныя, краёвыя, гарадскія, карпаратыўныя, прыватныя, можна зьвесьці да трох асноўных тыпаў, трох стылёвых напрамкаў, трох кампазіцыйных схемаў. Дзяржаўны герб – вянец геральдычнай сістэмы краіны. Некаторыя гербы праходзяць доўгі, як шашка ў дамкі, шлях ад прыватных эмблемаў да нацыянальных сімвалаў. Іншыя нараджаюцца са статусам афіцыйнай эмблемы краіны. Зразумела, што народу больш прэстыжна мець герб з багатым радаводам. Гербы “шляхетныя”, “паспалітыя”, “універсальныя” – так, на маю думку, можна назваць асноўныя тыпы твораў геральдыкі. Прапанаваная тут класіфікацыя не прэтэндуе на выключнасьць і вычарпальнасьць, а зьяўляецца толькі суб’ектыўным поглядам аўтара.

Кожны тып адпавядае пэўнаму перыяду ў гісторыі цывілізацыі. І як не бывае добрай ці кепскай гісторыі, так і гербы не падзяляюцца на добрыя і кепскія, правільныя і няправільныя. Герб – люстраны адбітак палітычнага і культурнага стану грамадства.

Першы тып герба складваўся эвалюцыйным шляхам, і, мабыць, гэтая акалічнасьць вызначыла ягоную жыцьцяздольнасьць. Бо тое, што разьвіваецца па законах прыроды, будзе здаравейшым за акселерата на вітамінна-допінгавай іголцы. Першы тып герба моцна ўкаранёны ў сваю гістарычную радзіму – Еўропу. Тут ён захаваны ў аўтэнтычнай альбо традыцыйнай форме. У астатнім сьвеце ён шырока распаўсюджаны ў форме, адаптаванай да мясцовых культурных традыцыяў і палітычных рэаліяў. Два другія тыпы гербаў народжаныя рэвалюцыямі – Вялікай Французскай і Кастрычніцкай. Іхнія арэалы значна меншыя і знаходзяцца па-за межамі еўрапейскага кантыненту. Геральдычную спадчыну Французскай рэвалюцыі сёньня трэба шукаць найперш у Лацінскай Амерыцы, Кастрычніцкай – у Азіі і Афрыцы (адзіны аскепак неіснуючага СССР на геральдычнай мапе Еўропы ўспрымаецца неадэкватным эстэтычнаму кантэксту кантыненту). Ну а самі “хросныя маці” гербавых навацыяў маюць цяпер дзяржаўныя сімвалы, якія можна трактаваць як разьвітаньне з памылкамі бурлівай маладосьці. На гербе Францыі – “ліктарскі зьвязак”, які з часоў Старажытнага Рыму сімвалізуе моцную, стабільную ўладу. А над новай Расіяй зноў лунае дзьвюхгаловы арол, аздоблены імператарскімі рэгаліямі.

Акрамя трох названых тыпаў ёсьць “гібрыды”, якія спалучаюць пакрысе адусюль. Гэта гербы колішніх сацыялістычных Балгарыі і Албаніі: схема гербаў тут “універсальная”(савецкая), а гербавыя фігуры (эмблемы) “шляхетныя”. Ці герб М’янмы (Бірмы), дзе схема “шляхетная”, а эмблема і навершша “савецкія”. Герб Ісландыі – “шляхетны”, але шчытатрымальнікі выкананыя натуралістычна, як на “паспалітым” гербе. Мяжа паміж “адаптаваным” гербам аднаго з асноўных тыпаў і “гібрыдам” даволі хісткая. Скажам, гербы незалежных краінаў, у мінулым брытанскіх калоніяў, часта маюць “шляхетную” схему на ўзор Еўропы, але большасьць кампанентаў герба (эмблема, шчытатрымальнікі, навершша...) мясцовага паходжаньня, “паспалітая”. Толькі палітычная і культурніцкая арыентацыя гэтых краінаў на былую метраполію дазваляе далучаць спрэчныя ў стылёвым сэньсе гербы да “шляхетнага” тыпу.

Яшчэ ёсьць гербы-“мутанты”. Стылёва яны могуць належаць да якога заўгодна тыпу, але вызначаюцца відавочным гвалтам над гістарычнай традыцыяй, дэманстратыўным ігнараваньнем здаровага сэнсу. Такая сімволіка абслугоўвае адыёзную ўладу. Як, напрыклад, герб нацысцкай Германіі. Паколькі ён адлюстроўваў пачварную ідэю, яго не

выратоўваў нават выдатны дызайн. Да “мутантаў” я далучыў бы гербы камуністычных рэжымаў Румыніі (намаляваны ў 1947-1948 гадах, праіснаваў да 1990-га) і Венгрыі (1949 – 1956). Такія геральдычныя опусы доўга не жывуць – адыходзяць, калі жыццё вяртаецца ў цывілізаванае рэчышча. Хоць гэтае “нядоўга” бывае расьцягваецца на дзесяцігоддзі.

Аман, Бутан, Бруней, Індыя, Іран, Карэя (Паўднёвая), Тайланд, Шры-Ланка, Японія – гербы гэтых краінаў як ілюстрацыя да сентэцыі Кіплінга пра Усход і Захад, якім “ніколі ня быць разам”. Гэта найперш сакральныя знакі, а ўжо потым палітычныя сімвалы. Азіяцкія сімвалы шматсэнсоўныя, як іерогліф. У параўнаньні з імі еўрапейскія канкрэтныя як літара ў слове. Адзіная ў еўрапейскай геральдыцы спроба спалучыць ў дзяржаўным сімвале Азію і Еўропу – арла, з часоў Рымскай Імперыі гербавую дамінанту Захаду, і сьвятую для Усходу свастыку арыяў, — адбылася ў Германіі ў 1933 годзе. Наступствы гэтага “мічурынскага” эксьперыменту для Еўропы былі катастрафічныя...

Колькі словаў пра Афрыку. Шматаблічнасьць геральдыкі гэтага кантыненту сьведчыць пра мноства культурніцка-палітычных уплываў і пра тое, што ніводны з якіх не дамінуе. Але патэнцыял гэтай часткі сьвету такі, што чакаць ад афрыканцаў можна чаго заўгодна. Новай эстэтыкі таксама. А сёньня мне падаюцца вартымі ўвагі спробы геральдычнага асэнсаваньня ўласна афрыканскай рэчаіснасьці, гісторыі, міфалогіі.

Варта адзначыць яшчэ, што дзяржаўным герб робіць улада, але нацыянальным ён становіцца толькі са згоды грамадства. Кожны народ рана ці позна здабывае сабе тую эмблему, якая годна рэпрэзентуе яго ў міжнароднай супольнасьці.

Першы тып герба, фактычна – асноўны, базавы для геральдыкі ўвогуле, сфармаваўся ў Сярэднявеччы. Нейкія родавыя знакі мелі ўжо славяне, што ладзілі выправы на Візантыю, і германцы, што рабавалі Рымскую Імперыю. Вядома, напрыклад, што заснавальнік франкскай дзяржавы Хлодвіг меў белы штандар з выяваю трох жабаў (вось адкуль пайшла француская гастранамія!). Менавіта ў гэтым ваяўнічым асяроддзі і быў пакладзены пачатак геральдычнаму стылю, які па праву можна лічыць і называць “шляхетным”. А фармаваўся стыль пад уплывам Хрысьціянства, калі на руінах антычнага Рыму трывала паўсталі барбарскія каралеўствы. Асновы гербатворства і гербазнаўства як культурніцка-палітычнай зьявы былі закладзеныя ў часе Крыжовых выправаў (XI-XIII стагоддзі). Герб “шляхетнага” ўзору складаецца з дзьвюх асноўных частак – гербавага шчыта з выявай (гербавай фігурай) і так званага верхняга герба (навершша), у складзе якога шалом, навершша-клейноды, намітка, а калі і карона. Дадатковыя элементы – шчытатрымальнікі па баках, дэвіз на стужцы. Усё гэта можа быць зьмешчана на тле мантыі, “дахам” для якой зьяўляецца карона. Ёсьць гер-


Герб Галандыі.



Герб Іспаніі.


Герб Швецыі.

бы, дзе мантыя трансфармуецца ў купалападобную "засень" ці ўпрыгожаная ордэнскімі знакамі. Ордэнскі знак і мантыя як кампаненты герба – пазьнейшае вынаходніцтва. Так бы мовіць, "для большай важнасьці". Прычым, зьявіліся гэтыя геральдычныя атрыбуты, калі ганарлівыя носьбіты рыцарскіх гербаў мусілі ў блізкай персьпектыве саступаць дарогу новаму пануючаму класу. Таму, у пэўным сэньсе, "мантыя" з "ордэнам" стала саванам Сярэднявечча. Геральдычныя шчыты бываюць пяці відаў. Кожны мае "нацыянальнасьць" – варажскі (гатычны трохкутны), італійскі (акруглы), іспанскі (закруглены), французкі (чатырохкутны, завостраны зьнізу), нямецкі альбо тарч (складанай формы). Сёньня большасьць дзяржаўных сімвалаў маюць "французскі" шчыт. У чыстым выглядзе ён скарыстаны на гербах Польшчы і Расіі, у крыху зьмененым – на гербе Украіны. У аснове гербавых шчытоў Латвіі і Летувы – "іспанскі" ўзор, Эстоніі – "нямецкі". Шчыт нашай "Пагоні" — "варажскі".

Гербы "шляхетнага" тыпу ад пачатку ўтварыліся як асабістыя эмблемы князёў і каралёў, як адзнака эліты. Яны гаварылі моваю сімвалаў, не разьлічанай на паспалітага чалавека. Усе гэтыя першасныя і другасныя геральдычныя фігуры, а таксама — натуральныя, штучныя і легендарныя "негеральдычныя", якіх толькі на гербе і сустрэнеш (іх яшчэ называюць эмблемамі), крыжы, "металы", "эмалі", "футры" вызначалі ерархію ўнутры пануючага класу. А людзям падлеглым дастаткова было разумець галоўнае: гербы сімвалізавалі ўладу, што абапіраецца на сілу. Таму на іх часта зьмяшчалі выявы драпежнікаў – львоў, арлоў, леапардаў. Прысутнасьць на такім гербе рэлігійнага сімвалу мусіла сьцьвярджаць: "Улада – ад Бога". Вось і ўся абэцэда для "нізоў". Гербы каталіцкіх ерархаў, якія часам мелі ўлады ня меней, чым які кароль, рабіліся па тых жа канонах, што і рыцарскія, але, зразумела, іх сімволіка была не ваяўнічай.

У сёньняшняй Еўропе ўсе дзяржаўныя гербы, за выключэньнем таго, які муліць вока канкрэтна нам, ды яшчэ герба Італійскай Рэспублікі (шэсьцерню з белай пяціканцовай зоркай пасярэдзіне атачаюць галіны алівы і дуба, зьвязаныя чырвонай стужкай) так ці інакш захоўваюць памяць пра Сярэднявечча. Італійцы ж свой герб прынялі ў 1946 годзе на рэферэндуме, калі перараблялі каралеўства ў рэспубліку. Відавочна, што на разумовых здольнасьцях нацыі тады сказалася стомленасьць вайною, прыгнечасьць ад паразы і злосьць на ўладу, якая да паразы давяла. Атрымалася, што "рымскія" арлы разьляцеліся па ўсім сьвеце, каб усталявацца ў дзяржаўных гербах мноства краінаў, а іхняя радзіма мае герб бальшавіцкага ўзору. Шкада вялікі народ. Беларусы італійцаў разумеюць як ніхто...

Цяпер геральдычны "заапарк" успрымаецца ня знакам пэўнай сацыяльнай групы, а сімвалам гістарычнага шляху нацыі. Але толькі ў краінах, дзе манархічная ідэя моцна ўкаранёная ў грамадскую сьвядомасьць і добра адаптаваная да сучасных сацыяльна-палітычных рэаліяў, дзе канстытуцыйнага манарха ўважаюць за "бацьку роднага", – толькі там гербы "шляхетнага" тыпу захавалі аўтэнтычную раскошу. Сёньня шмат краінаў усіх кантынентаў маюць стылізаваныя пад Сярэднявечча гербы-наватворы. А вось цалкам "укаплектаваныя"( шчыт з геральдычнымі фігурамі і эмблемамі, навершша шчыта, шчытатрымальнікі, стужка з дэвізам) гербы-аўтэнтыкі ёсьць толькі ў дзьвюх краінаў. Гэта еўрапейскія дзяржавы Злучанае Каралеўства Вялікай Брытаніі і Паўночнай Ірландыі ды Каралеўства Нідэрландаў. Парадаксальна тое, што такую пашану да традыцыі дэманструюць народы, якія першымі ў сьвеце зьдзейсьнілі буржуазныя рэвалюцыі (XVII-е стагоддзе). У рэвалюцыйнай справе кансерватыўныя брытанцы і стрыманыя галандцы на стагоддзе апярэдзілі экспансіўных французаў. Так гістарычна склалася, што на гербах Люксембургу і Швецыі адсутнічае дэвіз, на сімвале Манака няма гербавага наверша. У пералічаных дзяржавах герб манарха адначасова зьяўляецца гербам нацыі. Тое ж і ў Іспаніі. Але паколькі пэўны час краіна пасьпела пабыць рэспублікаю, а потым амаль трыццаць гадоў была юрыдычна каралеў-

ствам без караля, а фактычна пад аўтарытарным праўленьнем (гэтая акалічнасьць была адлюстраваная ў гербе тае пары), повязь часоў выяўленая ў сёньняшнім дзяржаўным гербе ня так відавочна, як у іншых манархіяў кантыненту.

Герб Каралеўства Іспанія, мабыць, самы рамантычны ў сьвеце. Ён, як і герб суседняй Партугаліі, захоўвае памяць пра вялікія геаграфічныя адкрыцьці. Гербавы шчыт атачаюць калюмны, што сімвалізуюць ”Геркулесавыя слупы” – скалы Гібралтар і Сеута. Гэта “брама Атлантыкі”. “Геркулесавыя слупы” як сімвал Гібралтарскай пратокі на гербе Іспаніі яшчэ з тых часоў, калі еўрапейцы ня ведалі пра зямлю за акіянам. Тады на калюмнах была стужка з надпісам “NON PLUS ULTRA” (“Далей – нічога”). Пасьля адкрыцьця Новага Сьвету дэвіз гучыць інакш — “ PLUS ULTRA” (“Усё далей”). Цудоўны дэвіз для краіны і народу! У перакладзе на беларускую гэта было б: “Не спыніць, не разьбіць, не стрымаць”.

У Нарвегіі, Даніі нацыя і кароль маюць асобныя гербы, але аднаго паходжаньня. Дзяржаўныя гербы гэтых краінаў – спрошчаны варыянт гербаў каралеўскіх. Каралеўства Бельгія, Княства Ліхтэнштэйн, Княства Андора маюць адносна сьціплыя ў параўнаньні з іншымі, так бы мовіць, “аскепкамі Сярэднявечча” дзяржаўныя сімвалы. На іх няма шчытатрымальнікаў, а на гербе Ліхтэнштэйну яшчэ адсутнічаюць навершша і дэвіз – затое ёсьць мантыя. Гэтая “сьціпласьць” ня ёсьць вынікам палітычных катаклізмаў і вымушанай “дэмакратызацыі”. Яна проста адлюстроўвае палітычны статус гэтых краінаў.

Час добра папрацаваў над гербамі еўрапейскіх манархіяў. Другаснае і выпадковае зьнікла, засталося істотнае – тое, што насамрэч здольнае яднаць нацыю. Але ня ўсе манархіі і, адпаведна, іх сімвалы аказаліся такімі трывалымі, як пералічаныя вышэй. Ды на шчасьце, далёка не заўсёды ператварэньне манархіі ў рэспубліку, ці дэмакратычнай рэспублікі ў сацыялістычную адбываецца так, як у кастрычніку 1917 году ў Расіі. У больш цывілізаваных краінах зьмена дзяржаўнага ладу не суправаджалася радыкальным адмаўленьнем ад гістарычнай сімволікі. Еўрапейцам, спадкаемцам вялікай культуры, увогуле ўласьцівы здаровы кансерватызм. У часе перадзелу ўлады, калі будучыня няпэўная, людзі падсьвядома шукаюць апірышча ў мінулым. Гэта датычыць і звыклых сімвалаў. Як моцнае дрэва ў часе буры губляе лісьцё і нават нейкія галіны, але захоўвае ствол, — так і сімвал, укаранёны ў народную сьвядомасьць, перажывае сацыяльныя буры і варожыя нашэсьці. Зьнікаюць другасныя элементы, але захоўваецца стрыжань – выява, якая здаўна была знакам зямлі і народу. Шэраг еўрапейскіх гербаў на сваім гістарычным шляху страцілі частку традыцыйных атрыбутаў, але захавалі сэнсавы стрыжань — галоўную эмблему. Нават краіны савецкага блоку, якіх, можна сказаць, гвалтам перацягнулі з



Герб Люксембургу.



Герб Германіі.



Герб Аўстрыі.

“захаду” на “ўсход”, мёртвай хваткай трымаліся за сваіх геральдычных зьвяроў, як за апошнюю барыкаду нацыянальнага духу. Толькі ў Румыніі нацыянал-камуністы не пажадалі мець на дзяржаўным гербе нацыянальнай эмблемы. Пры тым, што Румынія для Савецкага Саюзу была самай прабленнай краінай ва ўсім Варшаўскім дагаворы. Яна значна радзей азіралася на СССР у пытаннях палітыкі, чым іншыя хаўрусьнікі. А герба больш-менш прыстойнага ня мела.

У 20-м стагоддзі многія еўрапейскія гербы падвергліся “дэмакратызацыі”. Сёньня дзяржаўныя гербы Германіі, Чэхіі, Польшчы, Албаніі, Грэцыі, Румыніі, Расіі, Югаславіі структурна ўяўляюць сабою выяву галоўнай эмблемы на тле шчыта “французскага”тыпу, пазбаўленага ўсялякага атачэньня (лаўровы вянок вакол шчыта герба Грэцыі выглядае настолькі выпадковым, што яго можна ня браць у разьлік). Герб Венгрыі крыху “багацейшы”, бо ягоны шчыт увенчаны каронай. Арыгінальнае атачэньне гербавага шчыта ў выглядзе выявы старажытнага навігацыйнага прыбору – армілярнай сферы мае Партугалія. А вось Аўстрыя адмовілася нават ад геральдычнага шчыта і мае гербам толькі саму эмблему.

Фіны, эстонцы, латышы прыдбалі незалежнасьць пасьля развалу Расійскай імперыі. Дагэтуль яны ня мелі традыцыяў дзяржаўнасьці і, адпаведна, дзяржаўных гербаў. Таму статус дзяржаўных сімвалаў яны надалі сярэднявечным краёвым эмблемам. “Шляхетны” герб быў для іх пропускам у Еўропу. Жаданьне быць падобнымі на “сапраўдных” еўрапейцаў стала прычынаю таго, што дэмакратычныя рэспублікі аздобіліся княскімі гербамі. Пэўныя праблемы з дзяржаўнай сімволікай мела незалежная Летува (у сэньсе, Жамойць). Далёка ня ўсе грамадзяне маладой краіны лічылі “Пагоню” сімвалам, кансалідуючым нацыю. Для многіх гэта быў чужы знак, увасабленьне славянскага (“літоўскага”) ціску на іх радзіму. Абмяркоўваліся прапановы вярнуць краю ягонае гістарычнае імя, назвацца Жамойцкай Рэспублікаю, а гербам мець выяву мядзьведзя. Гэтае пытаньне закрылася толькі пасьля таго, як Сталін падарыў жамойтам Вільню, сталіцу Вялікага княства Літоўскага. Адвеку жамойты ненавідзелі Вільню, як жыхары калоніі сталіцу метраполіі. У гэтай сітуацыі трэба было альбо адмаўляцца ад свайго “медзьведзя”, альбо ад несваёй Вільні. Адмовіліся, зразумела, ад “медзьведзя”.

Асобнай гаворкі вартыя гербы Германіі і Аўстрыі. Тым часам, як большасьць краінаў кантыненту альбо захоўвае сярэднявечную стылістыку сваіх гербаў альбо стылізуе гербы-наватворы пад даўніну, немцы пасьля падзеньня сваёй імперыі радыкальна перарабілі выяву гербавага арла, захаваўшы ў новай стылістыцы ўласьцівую гэтай птушцы прыгажосьць, моц і агрэсіўнасьць.- Такім ён праіснаваў да 1933 году, такім адрадзіўся пасьля Другой сусьветнай вайны. Мяркую, немцы спакойна ўспрынялі мадэрнізацыю агульнадзяржаўнага сімвалу, бо незаменнымі заставаліся «шляхетныя» гербы земляў, з якіх складаецца Германія. У ФРГ такіх гербаў шаснаццаць. А вось аўстрыйцы пакінулі сваю гербавую птушку – чорнага арла Габсбургаў, збольшага такім як быў. Хіба што зрабілі з дзьвюхгаловага звычайным. І яшчэ: з 1918 году ён мае не імператарскую, а так званую “гарадскую” карону і трымае ў лапах замест імператарскіх рэгаліяў... серп і молат.У Аўстрыйскай Рэспубліцы гэтыя прылады працы ў якасьці дзяржаўнага сімвалу зьявіліся ў адзін год з бальшавіцкай Расіяй.

На сёньняшні дзень краіны, што вылучыліся з былой Югаславіі, краіны еўрапейскай часткі былога СССР (акрамя Беларусі), былыя савецкія сатэліты ў Еўропе маюць у якасьці дзяржаўных свае гістарычныя гербы. Недзе вяртаньне да нацыянальных каштоўнасьцяў адбылося праз “аксамітныя” рэвалюцыі, недзе было аплочана крывёю. Такім чынам, гісторыя “шляхетнага” герба, распачатая на руінах Рымскай Імперыі і, здавалася б, скончаная ў 1945 годзе на руінах Еўропы гвалтоўным падзелам кантыненту на “захад” і “ўсход”, мела драматычны і адначасова аптымістычны працяг напрыканцы 20-га стагоддзя. Еўропа зноў набыла, так бы мовіць, стылёвае адзінства – як перадумову адзінства

духоўнага. Паважлівае стаўленьне народ захоўвае толькі ў адносінах да сімвалаў, якія зьяўляюцца нацыянальнымі па сутнасьці, а ня толькі згодна юрыдычнага статусу. У сувязі з гэтым варта адзначыць, што ніводная краіна, дзе камунізм пацярпеў крах, а няпроста пахіснуўся (як у Беларусі), насамрэч ня стала ўтрымліваць ягоныя аскепкі на сваёй дзяржаўнай сімволіцы.

Другі тып гербу, “рэспубліканскі”(-па-беларуску “паспаліты”), сьцьвердзіўся ў часы буржуазных рэвалюцыяў і нацыянальна-вызвольных войнаў. Ягоная радзіма – рэвалюцыйная Францыя. Менавіта там упершыню дзяржава была абвешчаная ня ўласнасьцю кіраўніка, а здабыткам нацыі. Замацаваць гэты пераварот у сьвядомасьці грамадзянаў (не падданых!) і мусіла новая дзяржаўная сімволіка. Калі ў сярэднявечнай сімволіцы першасным  зьяўляецца герб, а сьцяг ад яго вытворны, дык у Новым Часе – наадварот. Сімвалам свабоды, знакам нацыі стаў “трыкалор” – сінебела-чырвоны сьцяг. Чырвоны і сіні колеры ўзятыя з кукарды народнай міліцыі, рэарганізаванай у Нацыянальную гвардыю, а на кукарду яны трапілі з гарадскога герба Парыжу. Белы скарыстаны як зьвязуючы – дзеля эстэтыкі. Сьцяг, які ўвасабляў народ, быў супрацьпастаўлены «шляхетнаму» гербу, як сімвалу ненавіснай арыстакратыі. Сьцяг і герб, якія звычайна суіснуюць у двухадзінстве, аказаліся па розныя бакі палітычнай барыкады. Але паколькі дзяржава, хай сабе і Рэспубліка, усё ж мусіла мець і такі сімвал, дык герб зрабілі са сьцягу. На розных варыянтах новага французскага герба трыкалоры, адлюстроўваючы пакручасты шлях нацыі на гістарычным пераломе, атачалі розныя эмблемы — то скрыжалі з тэкстам Канстытуцыі, то абрэвіатуру “RF” (“Рэспубліка Францыя”). Але атачэньне ўспрымалася ў непадзельным адзінстве з эмблемай ў адрозьненьне ад даволі аўтаномных сярэднявечных шчытатрымальнікаў ці гербавай мантыі. Ня менш папулярным, чым трыкалор быў у Францыі тае пары другі сімвал Свабоды — чырвоны фрыгійскі каўпак. Прырода гэтай папулярнасьці не зусім зразумелая. У XVII-XVIII стагоддзях у Францыі чырвоныя каўпакі насілі катаржнікі, прыкутыя да вёслаў на галерах. Чырвоны каўпак і дагэтуль лічыцца «фірмовай» адметнасьцю французскага катаржніка. Вонкава ён нічым не адрозьніваецца ад фрыгійскага.

Эстэтыка рэвалюцыі была непрыймальная для астатняй Еўропы. Ды і сама Францыя, калі новы лад усталяваўся больш-менш трывала, паціху пачала адыходзіць ад рэвалюцыйнага экстрэмізму, што адразу знайшло адлюстраваньне у афіцыйных сімвалах. Герб Напалеонаўскай імперыі раскошаю ўжо не саступаў ні колішняму каралеўскаму гербу, ні гербам іншых еўрапейскіх манархаў. Але ветрам свабоды французскае зерне занесла на іншы кантынент. “Паспалітая” эстэтыка аказалася вельмі дарэчнай у краінах Амерыкі, што вызваліліся ад каланіяльнай залежнасьці.



Герб Эквадору.



Герб Венесуэлы.




Герб Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі.

Сёньня, калі б'юць у званы пра пагрозу "амерыканізацыі" Старога Сьвету і сьвету ўвогуле, варта нагадаць, што Амерыка – гэта перакінутая праз акіян Еўропа. Нават сімвал "Новага Сьвету" — Статуя Свабоды, выбраленая ў Францыі і ўяўляе сабою ня што іншае як алегорыю Французскай Рэспублікі (такая ж скульптура, толькі значна меншых памераў стаіць у Парыжы). Геральдыка Амерыкі таксама прыклад еўрапейскай ідэалагічна-культурніцкай экспансіі, а канкрэтна – французскага ўплыву. Рэч у тым, што гербы незалежных краінаў амерыканскага кантыненту ад пачатку былі нацыянальнымі сімваламі, так як і эмблемы Французскай Рэспублікі. Ды і стылёвы ўплыў відавочны. Ён адчуваецца ў "заземленасьці" вобразаў, у боязі быць недастаткова рэвалюцыйным і, ня дай, Божа, занадта арыстакратычным.

Зразумела, што амерыканская геральдыка, асабліва калі казаць пра Амерыку Лацінскую, была нязвыклаю для выхаванага еўрапейскага вока. Структура гербаў нярэдка аморфная. Геральдычныя фігуры і эмблемы ў традыцыйным разуменьні адсутнічаюць альбо зьмененыя да непазнавальнасьці. Хіба што сустрэнеш арла ці льва, але не стылізаваных, як у Еўропе, а натуралістычных. Затое ёсьць грыфы, ламы, быкі, коні – прычым, не на ўмоўным фоне, а ў атачэньні геаграфічна канкрэтных краявідаў. Шырока прадстаўлены на лацінаамерыканскіх гербах і матэрыяльны сьвет. Стрэльбы, шаблі, гарматы, якімі заваявана Свабода; прылады працы, якімі ствараецца дабрабыт; якары, караблі як сімвал прысутнасьці на моры-акіяне...Часта на гербах зьяўляецца так званы "рог дастатку". На гербах Венесуэлы і Гандураса іх ажно па два. Лацінаамерыканская геральдыка гаворыць на "эсьперанта" рэвалюцыі – на мове вульгарнага матэрыялізму.

Паспрабуйце ўявіць, як выглядалі гэтыя гербы ў момант нараджэньня, калі нават сёньня, пасьля таго, як час сёе-тое адрэдагаваў, гэтай геральдыкаю можна палохаць эстэтаў. Сёньня "тыповы" герб краіны гэтага рэгіёну ўяўляе сабою шчыт, часта вычварнай формы, з карцінкаю, якая дае вычарпальнае ўяўленьне пра геаграфічнае знаходжаньне краіны, яе расьлінны і жывёльны сьвет, карысныя выкапні і барацьбу за свабоду. Вянчае гэтую панараму слуп, упрыгожаны чырвоным фрыгійскім каўпаком. Шчыт атачаюць сьцягі нацыянальных колераў, як на гербе рэвалюцыйнай Французскай Рэспублікі. Адно слова – "брыдкае качаня". Але страшнаватымі амерыканскія гербы "паспалітага" тыпу падаюцца толькі з еўрапейскага гледзішча. А самі носьбіты гэтых сімвалаў — маладыя нацыі Новага Сьвету, па-барбарску наіўна цягнулі на гербы ўсё, што сілкавала іхнюю нацыянальную гордасьць, што было вартага ў іхняй гісторыі.

Сьцягі атачэньня — вельмі важны кампанент новага, народжанага ў Францыі, але ўкаранёнага за акіянам, геральдычнага стылю. Сама Францыя ад гэтай стылёвай знаходкі адмовілася. Яе сёньняшні герб, нягледзячы на наяўнасьць дэвізу "LIBERTE, FRATERNITE, EGA-LITE", ня надта стасуецца з вобразам краіны, чыя рэвалюцыя перарабіла сьвет. У лацінаамерыканскіх гербах сьцягі атачэньня выконваюць функцыю, аналагічную той, што ў сярэднявечных — шчытатрымальнікі. Для прыкладу нагадаю гербы Дамініканскай Рэспублікі, Гаіці, Панамы, Сальвадору, Калумбіі, Эквадору, Перу. У некаторых выпадках сьцягі нават уваходзяць у структуру гербавай эмблемы (хоць само гэтае разуменьне ў "паспалітым"тыпе герба ня надта акрэсьленае).

Варта адзначыць тую акалічнасьць, што "паспаліты" стыль у форме ігнараваньня сярэднявечнай геральдычнай традыцыі сьцьвердзіўся ў асноўным у тых краінах кантыненту, якія пазбавіліся залежнасьці ад Іспаніі і Партугаліі. А там, дзе доўга панавала Вялікая Брытанія, збольшага абыйшлося без вызвольных паўстаньняў (ЗША – выключэньне). І калі метраполія пакінула свае каланіяльныя ўладаньні, незалежныя краіны зрабілі сабе гербы "шляхетнай" схемы, але з мясцовым каларытам. Шчытатрымальнікамі служаць ягуары і фламінга, на гербавым шчыце — пальмы, какосавыя арэхі, навершша ўупрыгожваюць кракадзілы і марскія ракавіны. Самы "шля-

хетны” на кантыненьце герб у Канады. Фактычна гэта герб Вялікай Брытаніі, прыгожа дапоўнены ўласна канадскімі атрыбутамі.

На маю думку, найбольш выразна ідэйны зьмест “паспалітай” геральдыкі выявіўся ў дзяржаўным гербе Злучаных Штатаў Амерыкі. Натуралістычна намаляваны белагаловы арол трымае ў дзюбе стужку з дэвізам “E PLURIBUS UNIUM” (“З многіх – адно”), які найлепшым чынам адлюстроўвае сутнасьць разуменьня “нацыя”. У пэўным сэньсе, гэты герб – вяршыня стылю і завяршэньне эпохі. Ён мусіў даводзіць, што Амерыка, колішняя калонія Еўропы, стала моцнай, самадастатковай, самаўпэўненай. Завяршаючы “паспаліты” стыль, паўночна-амерыканскі арол адным кіпцюром (альбо адным крылом?) ужо трапляе ў іншую геральдычную сістэму, якая яшчэ толькі мусіць сьцьвердзіцца ў гістарычнай перспектыве, у эпоху глабалізацыі. Трынаццаць зорак, што сімвалізуюць першыя трынаццаць штатаў, аб’яднаных у саюз, зьмешчаныя не на геральдычным шчыце на грудзях арла (дзе ім, здавалася б, самае месца), а над ягонай галавою ў промнях сонца і ў атачэньні аблокаў. Сімволіка даволі празрыстая: Амерыканская Рэспубліка ўзьнесеная над сьветам. У гэтым гербе ў зразумелай простаму амерыканцу форме выказаныя прэтэнзіі ягонай краіны на ролю сусьветнага лідэра. Кожны нацыянальны герб у пэўным сэньсе зьяўляецца пасланьнем чалавецтву. Але найперш ён сімвал канкрэтнай тэрыторыі і знак самадастатковасьці канкрэтнага народу. На адным са сьцягоў Амерыканскай рэвалюцыі была выява грымучай зьмяі і надпіс “Не чапай мяне!”. Амерыканцы правільна разумелі, нашто ім патрэбная дзяржава: каб ад іх адчапіліся. А герб гэта таўро, якім нацыя-гаспадар пазначае сваю маёмасьць-краіну. Амерыканскія зоркі ў промнях сонца — гэта вобраз для ўнутранага карыстаньня, зварот да пачуцьцяў народу Злучаных Штатаў. Свайго роду геральдычная псіхатэрапія, расьцягнуты на дзесяцігоддзі сеанс самаўнушэньня. А маладой краіне, якая камплексавала перад Старым Сьветам, такая тэрапія была ня лішняю. Амерыканскі гербавы арол хоць і зьяўляецца папярэднікам “універсальных” гербаў, усё ж застаецца ў межах “паспалітасьці”. Ён занадта нацыянальны. А на ролю ўніверсальнага можа прэтэндаваць толькі нічыйны сімвал. Такі як крыж, паўмесяц, свастыка, серп-молат, зорка. Мусіў прайсьці час, перш чым ідэя, шэптам і ”для сваіх” выказаная ў дзяржаўным гербе ЗША, на поўны голас і на ўвесь сьвет загучыць у дзяржаўным гербе Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Першым у шэрагу гербаў “універсальнага” тыпу.

“Шляхетны” герб нарадзіўся як знак уладара, “паспаліты” — як сімвал нацыі, “універсальны” — як праява ідэалогіі глабалізму. У гербе СССР нацыянальны зьмест цалкам адсутнічае, хоць згодна са сваім статусам ён павінен прадстаўляць не абстрактнае чалавецтва, а канкрэтную дзяржаву і народ. Ён з’арыентаваны вык-




Герб Югаславіі (1945-1991).



Герб ГДР (1952-1990).




Герб Румыніі (1947-1990).

лючна на “пралетарыяў усіх краінаў”. Саму наяўнасьць у былой Расійскай імперыі такога гербу астатні сьвет мог трактаваць як праяву ідэалагічнай агрэсіі, як спробу ўплыву на “пралетарыяў” за межамі “дзяржавы рабочых і сялянаў”і распаўсюджаньня сваіх парадкаў на ўсю планету. Гэта самы ваяўнічы герб за ўсю гісторыю чалавецтва, хоць у свой час Ленін уласнаручна выкрасьліў з ягонага канцэптуальнага эскізу (герба РСФСР) выяву мяча.

Гісторыя герба Савецкага Саюзу пачалася з герба РСФСР. Ён рабіўся тады, калі пра СССР гаворкі яшчэ не было, і бальшавікі трактавалі “права нацыяў на самавызначэньне” як права на аўтаномію ў Савецкай Расіі. Герб рабіўся як “дзяржаўны”, але стаў першым ў шэрагу “рэспубліканскіх”. Ён яшчэ захоўвае нейкую повязь з мінулым. Бо эмблема – выява перакрыжаваных сярпа і молата ў промнях узыходзячага сонца, зьмешчаная на картушы (барочны варыянт “нямецкага” шчыта). Па ўзору герба Савецкай Расіі быў зроблены яшчэ герб Украінскай ССР, а потым шчыт зьнікае і болей у савецкім гербатворстве не зьяўляецца. Адмова ад стрыжнявога элементу мастацтва геральдыкі — гэта заяўка на фармаваньне ўласнага стылю. Але форматворчасьць у дадзеным выпадку была падпарадкаваная больш важнай задачы — перагляду вобразнага зьместу геральдыкі. Ад геральдычнага шчыта адмовіліся, бо бачылі ў ім атрыбут “старасьвеччыны”. А трымалася “старасьвеччына” на рэлігіі і патрыятызьме. Новая ўлада зыходзіла з пастулатаў, што “ў пралетарыяту няма Айчыны” і “рэлігія – опіум для народу”. А калі так, дык разрыў з Айчынай і рэлігіяй быў прадвызначаны.

Без рэлігійнай традыцыі еўрапейская геральдыка проста не існуе. Ад яе ня стала адмаўляцца і Амерыка. Прэтэнзія на месіянства рэлігійнага кшталту адчуваецца ў гербе ЗША, а на долары дык наўпрост канстатуецца “IN GOD WE TRUST”. Рэлігійныя сімвалы прысутнічаюць на гербе Дамініканскай Рэспублікі. А шчыты трохкутнай формы на гербах Сальвадору і Нікарагуа вельмі нагадваюць “божае вока”. Пайсьці супраць ураду ці нават супраць “памазаніка Божага” – гэта адна справа, а вось супраць Бога... Да такой думкі, такой акцыі яшчэ трэба было сасьпець. Чалавецтва ў асобе Расіі сасьпела ў 1917 годзе. Ня меншым цынізмам трэба было валодаць, каб абвясьціць па-за законам патрыятызм як зьяву.

Як сьведчыць гісторыя, каб нейкая краіна прыняла ў якасьці дзяржаўнага герб савецкага ўзору, патрэбна была альбо рэвалюцыя з грамадзянскай вайною, альбо прысутнасьць на яе тэрыторыі “абмежаванага” вайсковага кантынгенту іншай дзяржавы. Хоць гербы “братоў па класе” былі вельмі падобныя на дзяржаўны сімвал СССР, дамагчыся суцэльнай уніфікацыі геральдыкі Масква здолела толькі ад уласных саюзных рэспублік. На гербе кожнай абавязкова прысутнічалі серп-молат, чырвоная пяціканцовая зорка, выява сонца, чырвоная стужка з дэвізам-зваротам да пралетарыяў усяго сьвету на дзьвюх мовах. “Нацыянальнасьць” акрамя мовы дэвізу выяўлялася праз натуралістычна ці больш-менш умоўна намаляваныя краявіды і прысутнасьць у абвітых стужкаю вянках расьлінаў, на якіх сьпецыялізавалася сельская гаспадарка рэспублікі. Просталінейнасьцю мастацкага вырашэньня, інфармацыйным зьместам гербы саюзных рэспублік (за выключэньнем РСФСР і Украінскай ССР) вельмі нагадвалі Лацінскую Амерыку. З той розьніцай, што для лацінаамерыканцаў іхнія гербы сімвалізавалі суверэнітэт, а для савецкіх рэспублік – ягоную адсутнасьць. Згодна логікі “саюзнага цэнтру” ўсе, каторыя ня рускія, мусілі быць шчасьлівымі ўжо з той прычыны, што маюць свой знак, які дазваляе хоць неяк адрозьніваць адну “савецкую сацыялістычную рэспубліку” ад другой (пры тым, што афіцыйнаю мэтаю “ленінскай нацыянальнай палітыкі” было “зьліцьцё нацыяў і народнасьцяў у адзіны савецкі народ»).

А вось еўрапейскія сатэліты СССР, нягледзячы на палітычны ціск з боку “старэйшага брата” і прысутнасьць ягонага войска на сваёй тэрыторыі, упарта, учэпіста, як п’яны шляхцюк, за ствол генеалагічнага дрэва, трымаліся за сваю нацыянальную тоеснасьць.Чым вышэй культурны ўзровень народу, тым цяжэй было

прымусіць яго прыняць "савецкую" геральдыку. Вымушаныя, як і саюзныя рэспублікі, "упрыгожыць" свае дзяржаўныя гербы пяціканцовымі зоркамі і чырвонымі стужкамі, яны гэтым і абмежаваліся. Ня сталі кранаць гістарычных эмблемаў, якія зьяўляюцца сутнасьцю герба. Так і жылі яны: хоць і пад Масквой, але са сваім гонарам. Балгары і чэхі захавалі на сваіх гербах часоў знаходжаньня ў "сацыялістычным лагеры" выявы геральдычнага льва. А яшчэ на балгарскім гербе акрамя даты іхняй сацыялістычнай рэвалюцыі быў пазначаны год 681, год нараджэньня Балгарскай дзяржавы.На венгерскім гербе з 1956 па 1990 год ролю эмблемы адыгрываў шчыт сярэднявечнага выгляду з колерамі нацыянальнага сьцягу. Такім герб стаў у выніку рэвалюцыі 1956 году, такое венграм выйшла "паслабленьне рэжыму". А да гонару палякаў трэба адзначыць, што яны здолелі адстаяць свой гістарычны герб і нават не зьмянілі ягонай стылістыкі, ня сталі ўплішчваць яго ў вянок з жытнёвых каласоў, перавіты стужкаю колеру "пралетарскага інтэрнацыяналізму". Адзіная ахвяра: давялося прыбраць з галавы "белага арла" да лепшых часоў карону. Толькі ад Усходняй Германіі Савецкі Саюз дамогся таго, чаго ня здолеў ад іншых сатэлітаў. Германская Дэмакратычная Рэспубліка, што была створаная з Савецкай акупацыйнай зоны, мусіла адмовіцца ад спрадвечнай нямецкай нацыянальнай эмблемы – арла. Матывацыя: пераадоленьне нацысцкага мінулага. Герб ГДР меў эмблемаю сімвал працы – малаток і цыркуль, вакол вянок з каласоў і стужку на вянку, але не чырвоную, а колераў нямецкага нацыянальнага сьцягу. Паколькі пяціканцовая чырвоная зорка ўспрымалася ў Германіі найперш як эмблема Савецкай Арміі, а ўжо потым як сімвал сацыялізму, на герб яна ня трапіла.

Дарэчы, гістарычна так яно і было. Першая афіцыйная эмблема Савецкай улады — Чырвонаармейская пяціканцовая зорка. "Серп і молат"сімвалізуюць нібыта мірную працу, але прыйшлі яны з савецкай вайсковай эмблемы, дзе атабарыліся ў цэнтры. Але і там гэты сімвал зьявіўся не адразу. Напачатку планавалі ўпрыгожыць зорку... свастыкай. Ды потым вырашылі, што будзе занадта мудрагеліста. Нейкі час чырвонаармейскай эмблемай была "марсова звезда с плугом и молотом", і нарэшце – з сярпом і молатам.

На гербе "савецкага" тыпу эмблему (даволі часта гэта тыя ж серп-молат ці іншыя прылады працы) было прынята зьмяшчаць унутры вянка з жытнёвых каласоў ці якой іншай "карыснай" расьліны. Фонам для іх служыў акультураны "сацыялістычны" краявід (гербы Лаоса, Паўночнай Карэі), узыходзячае сонца, шэсьцярня як сімвал прамысловасьці (Балгарыя, Кампучыя, В'етнам). Пяціканцовая зорка, чырвоная ці залатая, як правіла, кампазіцыю завяршала. Як карона завяршае "шляхетны" герб. Гербы ўвогуле падкрэсьлена "мірныя", за выключэньнем Мазамбіка і Рэспублікі Буркіна-Фасо, якія дагэтуль маюць на гербах выявы аўтамата Калашнікава.

Ёсьць праблема, якую геральдыка



Герб Таіланду.



Герб Японіі.




Герб Мазамбіку.

вырашае ўжо не адно стагоддзе. У Сярэднявеччы ў герб спрабавалі ўціснуць сімвалы ўсіх тэрыторыяў, што ўваходзілі ў склад дзяржавы. Часам атрымлівалася ня дужа прыгожа. Тады і прыдумалі падзяляць малы і вялікі гербы. Малы – шчыт з галоўнай эмблемай дзяржавы. Вялікі – ён жа ў атачэньні гербоў падуладных тэрыторыяў і ўсялякіх рэгаліяў. Малы на кожны дзень, вялікі да ўрачыстых выпадкаў. Некаторыя краіны мелі яшчэ і сярэдні герб, але гэта ўжо асобная гаворка... На гербе “паспалітага” тыпу, калі ёсьць у гэтым патрэба, штаты і правінцыі пазначаюць абстрагаванымі сімваламі — зоркамі. “Універсальная” геральдыка савецкага ўзору і канкрэтна герб Савецкага Саюзу народы і тэрыторыі ігнаравалі як зьяву, што замінае “сусьветнай рэвалюцыі”. Наўрад ці заклік да пралетарыяў сьвету на мовах пятнаццаці рэспублік на стужцы саюзнага герба можна лічыць знакам нацыянальнай прысутнасьці. У Югаславіі, таксама шматнацыянальнай краіне, паспрабавалі надаць наднацыянальнай сімволіцы эмацыянальнасьць і вобразную канкрэтыку. Рэспублікі на саюзным гербе гэтай краіны прадстаўлялі шэсьць паходняў, зьлітых у адзіным полымі.

Тое, што не належыць нікому канкрэтна, пры пэўных абставінах можа яднаць усіх. Як яднае сёньняшнюю Еўропу вянок з дванаццаці залатых зорак на сінім тле. Як трымае Злучаныя Штаты Амерыкі зорна-паласаты сьцяг. Як адзіны на ўсіх сьцяг ААН. Чаму так не атрымалася з серпам-молатам? Чаму ня здолела надалей існаваць пад чырвонай зоркай Югаславія? Прычына тая, што наднацыянальны сімвал у шматнацыянальным грамадстве мусіць быць не падменаю нацыянальных эмблемаў, а існаваць у палітычнай рэчаіснасьці паралельна з імі. Не адбіраючы радзімы, даваць пачуцьцё далучанасьці да Сусьвету. Нездарма колішнія брытанскія калоніі, прыдбаўшы суверэнітэт, захоўваюць у сваіх дзяржаўных сімвалах атрыбуты былой метраполіі, а краіны, што вылучыліся з СССР, перш-наперш пазбавіліся гербаў і сьцягаў, што нагадвалі ім пра знаходжаньне ў гэтай звышдзяржаве. Сёньня гербаў, стылёва і сэнсава з’арыентаваных на савецкі, засталося ў сьвеце каля дзесятка, усяго ж дзяржаваў на планеце больш за дзьвесьце. Праўда, савецкая схема герба сёньня ў пашане ў арганізацыяў і краінаў, якія практыкуюць радыкальны ісламізм...

Дзяржаўны герб Савецкага Саюзу вызначыў цэлую эпоху ў разьвіцьці геральдыкі. У сьвеце няма іншай дзяржаўнай эмблемы, якая б так зразумела і выразна адлюстроўвала палітычную ідэю. Але, нажаль, гэтую эпоху трэба класіфікаваць як застойную, а савецкі напрамак у геральдыцы “універсальнага” тыпу як тупіковы. Народы, якія гісторыя ў мінулым стагоддзі пазначыла «серпам-молатам» адчувалі сябе пад гэтым гербам катаржнікамі ў фрыгійскіх каўпаках. Не на тую ідэю паставілі перабудоўшчы-кі сьвету ў памятным 1917-м. Не натхняе народы персьпектыва страты сваёй самасьці, тым больш, — у імя ідэалогіі, якая ігнаруе чалавека як асобу, а за асобаю не прызнае чалавечых правоў. Ня здолела Расія прапанаваць сьвету прыстойную праграму глабалізацыі. Культуры не хапіла... Зрэшты, адмоўны досьвед – таксама досьвед. Можа атрымаецца ў іншых, разумнейшых...

Геральдычны “хіт” канца 20-га стагоддзя і пачатку стагоддзя новага — эмблема Еўрасаюзу. Мець права вывесіць свой нацыянальны сьцяг побач з тым, дзе дванаццаць залатых зорак на сінем тле – мара ўсіх народаў Цэнтру і Усходу кантыненту. Першым крокам вяртаньня ў Еўропу для нашых заходніх суседзяў было аднаўленьне дзяржаўных сімвалаў еўрапейскага кшталту. Тое ж самае ў 1991 годзе зрабілі і мы. За час, што прайшоў з тае пары, нашая ўпэўненасьць, што найлепшае атачэньне для “Пагоні” — зоркі еўрапейскага сьцягу, толькі ўмацавалася. Бо кожны патрыёт жадае бачыць сваю Айчыну «апранутай у сонца».